*І. А. Гамановіч*
Навуковы кіраўнік — *А. І. Белая,* кандыдат педагагічных навук, дацэнт
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

# СТАНАЎЛЕННЕ ПАЛІТЫЧНАГА СВЕТАПОГЛЯДУ ГЕРОЯ ЯК ЭСТЭТЫЧНАЯ ПРАБЛЕМА Ў РАМАНЕ М. ГАРЭЦКАГА «ВІЛЕНСКІЯ КАМУНАРЫ»

На характар мастацкай канцэпцыі асобы ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя не маглі не ўплываць такія адзнакі гістарычнага часу, як адчуванне стыку эпох, пераходнасці, знаходжання напярэдадні (а пазней і ў эпіцэнтры) лёсавызначальных зрухаў і падзей. Гэта зрабіла актуальнай праблему ідэнтычнасці, у адпаведнасці з якой асоба выбірае пэўную жыццёвую стратэгію. Ідэнтычнасць мае на ўвазе «характарыстыку індывіда з пункту погляду прыналежнасці да якой-небудзь групы, супольнасці» [6, с. 106—107]. Набыццё ідэнтычнасці можа разглядацца «як некаторая рацыяналізацыя сітуацыі, дасягненне пэўнай яснасці ў яе асэнсаванні і ўсведамленні ўласнага становішча ў сістэме сацыяльных адносін» [9, с. 31]. Менавіта літаратура на ўсім працягу свайго існавання выпрацоўвала своеасаблівыя формулы асабовай ідэнтычнасці. Здольнасць да актаў самапазнання, самаацэнкі, практычнага самавызначэння і выступае асноўнай прыметай асобы. Рэфлексія стварае асабовае «Я», забяспечвае ўстойлівую цэласнасць, неабходную пры ўзаемадзеянні са знешнім асяроддзем, у тым ліку з сацыяльнасцю. Уласцівыя чалавеку пасіўнасць, несвабода, неразвітая свядомасць і адсутнасць годнасці пазбаўляюць яго права быць асобай.

Праблема самаідэнтыфікацыі заканамерна абвастраецца на пераломных этапах гісторыі. У самых агульных рысах яе якасць увасабляецца ў характар адказу на пытанне «Хто я ў культуры?», адлюстроўвае адпаведнасць асабістага ўсеагульнаму, разнастайнага ўніверсальнаму, выяўляе абарону асабістага, фіксуе адпаведнасць вобраза «Я» яго жыццёваму ўвасабленню і, у выніку, характарызуе стан прыналежнасці чалавека надындывідуальнаму цэламу — гісторыі, грамадству, культуры. Ідэнтычнасць — гэта «вызначэнне свайго месца ў гісторыі» [1, с. 175].

Раман М. Гарэцкага «Віленскія камунары» — буйны твор беларускай прозы 30-х гадоў мінулага стагоддзя, адзін з найбольш значных тагачасных раманаў. У ім даволі падрабязна расказваецца пра новы этап у гісторыі працоўнага народа, звязаны з пачаткам рэвалюцыйнага руху канца 90-х гадоў XIX стагоддзя, з дзейнасцю рэвалюцыйных гурткоў у Вільні.

У рамане дэталёва распрацоўваецца праблема палітычнай ідэнтычнасці асобы. Дадзеная праблема найперш знайшла ўвасабленне ў вобразах Міхася і Мацея Мышкаў. Палітычная ідэнтычнасць фарміруецца ў выніку асэнсаванага атаясамлівання індывіда з палітычнымі аб’яднаннямі (партыямі, саюзамі) па меры праяўлення імі палітычнай актыўнасці [7, с. 161]. Аўтар звяртае ўвагу на фактары, якія паўплывалі на станаўленне светапогляду герояў.

М. Гарэцкі, ствараючы вобразы Міхася і Мацея Мышкаў, паказвае, як «патомкі былых прыгонных пана Хвастуноўскага з вёскі Жабракоўкі Брудзянішскай воласці станавіліся свядомымі і актыўнымі барацьбітамі за сацыяльную справядлівасць, за новае жыццё» [2, с. 164].

Аўтар паказвае шлях станаўлення светапогляду герояў. Як сказана ў рамане «Віленскія камунары» адносна Міхася Мышкі, першы раз у сваім жыцці Міхась Мышка ад гурткоўцаў пачуў новае слова —«таварыш». Яно моцна запала ў яго сэрца: «Аж мурашкі пабеглі па спіне, сэрца замлела» [3, с. 157]. Да таго ж «падарожжа па розных гарадах, знаёмства з рознымі людзьмі адчыніла яму вочы на жыццё. Першая рэвалюцыйная пракламацыя трапіла яму ў рукі, калі ён быў у Пецярбургу — ад каго і як, ён ужо потым і сам не памятаў. Але, спачуваючы рэвалюцыйнаму руху, ён доўгі час не ведаў, дзе ж яны, гэтыя рэвалюцыянеры, як іх знайсці, каб далучыцца» [3, с. 156]. Аўтар адзначае, што «для падвышэння кваліфікацыі» [3, с. 153], герой здзяйсняе «вандроўкі з горада ў горад, з гарбарні ў гарбарню» [3, с. 153]. Менавіта такім чынам герой далучаецца да рэвалюцыйнай барацьбы.

М. Гарэцкі ўказвае на фактары, якія паўплывалі на станаўленне светапогляду Міхася Мышкі. У рамане адзначаецца любоў героя да кнігі, што ў канчатковым выніку стане адной з прычын светапогляднага разыходжання паміж ім і яго сынам Мацеем: Міхась прыме палітычную платформу меншавікоў, а Мацей далучыцца да «віленскіх камунараў». І, нарэшце, схільнасць Міхася захапляцца мастацкай літаратурай, «смешна напісанымі» апавяданнямі Гогаля дапамагае лепш зразумець яго неспакойную натуру, жаданне пазнаць свет [8, с. 437].

Праблема эстэтычнага асваення тэмы горада, рэвалюцыйна-вызваленчага руху мела для пісьменніка актуальнае значэнне. Змены ў жыцці «вясковага свінапаса» Міхася Мышкі далі аўтару «Віленскіх камунараў» магчымасць заглыбіцца ў гэтую тэму, сказаць сваё, важнае мастакоўскае слова. Так, пісьменнік адразу скіроўвае сюжэтнае дзеянне ў канфліктнае рэчышча. Трапіўшы ў горад, хлапчук адчувае сябе шчаслівым абраннікам лёсу: «гэта ж ён у людзі выходзіць, шаўцом будзе, боты будзе шыць, грошы вялікія зарабляць…» [3, с. 148]. Але юнацкая мара аказалася недасяжнай: у шавецкай майстэрні хлапчук не мог задаволіць прагу пазнання, бо тут панавалі прагматызм, карыслівасць, голы разлік.

Апавядаючы пра рэвалюцыйную дзейнасць Міхася ў горадзе, аўтар вылучае на першы план не падзейны бок, а пытанні маральна-этычнага парадку, у прыватнасці тое, што галоўнае для Міхася была не адцягненая

Репозиторий БарГУ

ідэя, а чалавек, яго лёс [4, с. 415]. Напрыклад, рэвалюцыянера Лекерта царскія ўлады асудзілі на смерць праз павешанне, Мышка перажываў прысуд як асабістую трагедыю: «…цэлую ноч праплакаў па ім, як дзіця, рукі ламаў, ледзь галавою аб сценку не біўся…» [3, с. 160]. І пасля свайго арышту Мышка праяўляе сілу духу, самаахвярнасць, каб імёны таварышаў па арганізацыі не сталі вядомыя ўладам. «…Успамінаў потым, што нікога, нават мімаволі, не выдаў, ні ў чым не прагаварыўся, як пастанавіў спакойна чакаць суду і хоць бы і прыняць смерць, — дык зрабілася яму лёгка і добра.

Клапаціўся толькі пра маці і мяне, што цяжка нам будзе жыць без яго. Вельмі хацеў нас убачыць, але доўга не дазвалялі…» [3, с. 169].

Высокі духоўны патэнцыял Міхася Мышкі выразна раскрыўся і ў сітуацыі, калі жандармскі палкоўнік прапанаваў яму стаць сакрэтным агентам ахранкі. Міхась з абурэннем адмовіўся ад ганебнай ролі правакатара [4, с. 415].

Клопат пра сяброў-аднадумцаў, родных і блізкіх і быў тым маральным фактарам, які накіроўваў героя на шлях чалавечнасці і высакароднасці. М. Мушынскі адзначае, што ў такой трактоўцы вобраза Міхася Мышкі выявілася гуманістычная канцэпцыя Гарэцкага-мастака: «такія людзі, як Міхась Мышка, і маглі ў канчатковым выніку прывесці рэвалюцыю да перамогі, бо ў сваёй дзейнасці зыходзілі з гуманістычных ідэалаў…» [4, с. 419 ]. Трагічны парадокс гісторыі быў, аднак, у тым, што працоўныя масы пайшлі за іншымі кіраўнікамі рэвалюцыі, за тымі, для каго гуманістычныя прынцыпы, самакаштоўнасць асобы чалавека з'яўляліся адцягненымі паняццямі, былі чужымі, варожымі рэвалюцыйнай практыцы [4, с. 415]. У іх лік трапіў і Мацей Мышка.

Народжаны ў той час, калі беззямельны галодны мужык мог адчуць сябе асобай і з пачуццём асабістай годнасці крыкнуць: «Зямлі і волі!», ён трапіў у бездань, дзе паветра, насычанае псеўдасвабодай, ап'яняла свядомасць колькасцю палітычных ідэй, пракламацый і арганізацый. І ў такой атмасферы трэба было сцвердзіць сваё ўласнае «Я» [5, с. 109].

Такім чынам, герой стварае свой уласны лёс, а значыць, і сваю ўласную гісторыю. Аднак нельга адназначна заяўляць, што гэты герой будуе сваё жыццё па ўласнай схеме. Яго гісторыя ўжо мае пачатак у біяграфіях дзеда-самагубцы і бацькі-бунтара. Але іх побач няма, і герой самастойна імкнецца знайсці сваё месца ў жыцці [5, с. 110].

Погляд Мацея на рэвалюцыю, на яе сутнасць складваліся паступова, праз сумненні і роздум. У зацятых спрэчках з бацькам і жонкай Мацей доўгі час кіруецца ўяўленнямі і прынцыпамі, запазычанымі ў бальшавікоў.

На рашучы перагляд ідэйных перакананняў Мацея істотна паўплывала паражэнне паўстанцаў. Асабліва ўразіла яго самагубства кіраўнікоў Рэўваенсавета, іхняя адасобленасць ад радавых абаронцаў клуба: «Яны ж нам нічога не сказалі. Сабраліся кучкаю і пастанавілі». Мацей зразумеў, што ўчарашнія правадыры — гэта ахвяры рэвалюцыйнай ідэалогіі, і чалавечае жыццё, нават сваё ўласнае, яны не цанілі. Вуснамі Мацея Мышкі, пісьменнік-гуманіст выразна акрэсліў сутнасць дзейнасці ідэолагаў і кіраўнікоў рэвалюцыі: у «вялікай… прыгожай лабараторыі» яны «дослед свой рабілі», на «фабрыцы шумнай… няўмоўчнай» гэты дослед «рэалізавалі» [4, с. 416].

Сімволіка-абагулены ўрбаністычны вобраз «прыгожай лабараторыі», «фабрыкі шумнай», дзе на чалавечых лёсах ставяць «дослед», дапамагае лепш зразумець псіхалагічныя матывы адмовы Мацея пераехаць на сталае месца жыхарства з Вільні ў Мінск. Мацей разумее, што не за тую Беларусь ён змагаўся, у якую кліча яго бацька: «А я думаю, — разважае Мацей, — не ўсім жа туды ехаць. Трэба ж некаму і тут заставацца, пакуль можна…» [4, с. 417].

Не было цвёрдай перакананасці ў сваёй палітычнай барацьбе і ў бацькі Мацея Мышкі. Вярнуўся ён з Сібіры зацятым меншавіком, а ў час абароны Вороняй нібыта падтрымлівае бальшавікоў [10, с. 136].

Такім чынам, М. Гарэцкі ў рамане «Віленскія камунары» адлюстраваў складаны шлях беларускага працоўнага народа да ўсведамлення свайго месца ў гісторыі. Аўтар акцэнтуе ўвагу на адметнасці палітычных арыентацый выхадцаў з сялян-земляробаў, паказвае, як у перыяд грандыёзных грамадскіх зрухаў у сферу палітычнай самаідэнтыфікацыі пачынае перамяшчацца і спрадвечны духоўна-маральны канфлікт дзяцей і бацькоў.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Мельник, В. А.* Современный словарь по политологии / В. А. Мельник. — Минск : Кн. Дом, 2004. — С. 106 —107.
2. Проблемы религиозно-культурной идентичности в русской мысли XIX—XX веков: современное прочтение : учеб.-метод. пособие / автор-сост. Г. Я. Миненков. — Минск : БГУ, 2003. — 656 с.
3. *Белая, А. І.* Герой. Асоба. Характар : мастацкая персаналогія ў беларускай прозе першай трэці XX стагоддзя : манагр. / А. І. Белая. — Баранавічы : РВА БарДУ, 2012. — 517 с.
4. *Менцюк, Л. В.* Гражданская идентичность как предмет социологического исследования / Л. В. Менцюк // Социология. — 2008. — № 1. — С. 159 — 165 с.
5. *Бугаёў, Д.* Максім Гарэцкі / Д. Бугаёў. — Мн. : Бел. навука, 2003. — 237 с.
6. *Гарэцкі, М.* Збор твораў : у 4 т. / Максім Гарэцкі. — Мн. : Маст. літ. — 1985. — Т. 3. — 399 с.


Матэрыял паступіў у рэдакцыю 10.12.2012 г.